# ЯК МЫ МОЖАМ ДАПАМАГЧЫ?

Для таго каб захаваць Тураўскі і іншыя паплавы — перліны прыроды Палесся, трэба:

1. Арганізаваць рэгулярны выпас свойскай жывёлы на поплаве, але толькі пасля 15 чэрвеня (калі птушаняты падрастуць).
2. Не праводзіць пікнікі і не распальваць вогнішчы на поплаве да ліпеня.
3. Вясной і летам не браць з сабой на поплаў сабак.
4. Не збіраць яйкі птушак.
5. Не пакідаць смецце на поплаве.

**Калі вы сталі сведкам парушэння, паведаміце супрацоўнікам Тураўскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (тэл. 8–02353–75305) альбо на інтэрнэт-рэсурс www.iba.ptushki.org/threat**



Рэгулюемы выпас коней. Фота В. Фенчука





Жадаеце дапамагчы захаваць унікальнае Тураўскае балонне? Станьце адным з яго захавальнікаў! Гэта вельмі проста: запоўніце анкету "Стань захавальнікам ТВП" на **www.iba.ptushki.org**, праз гэты партал паведамляйце пра пагрозы для Тураўскага балоння і сваеназіранні за ім, а таксама разам з намі ўдзельнічайце ў прыродаахоўных мерапрыемствах.

ЗАХОДЗЬЦЕ НА СТАРОНКУ

**www.iba.ptushki.org**

**або тэлефануйце: 8(017)263-06-13**

АБО СКАНІРУЙЦЕ

ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"
(8017) 263-06-13
(8029) 223-06-13
(8029) 101-68-87
info@ptushki.org
**www.ptushki.org**

www.fb.com/APB.BirdLife.Belarus
www.vk.com/ptushki
www.twitter.com/ptushki

Выданне падрыхтавана ў межах праекта «Развіццё і ўмацаванне сеткі захавальнікаў вакол значных водна-балотных угоддзяў» пры падтрымцы прыродаахоўнай асацыяцыі "Каалiцыя Чыстая Балтыка"



# ЧАМУ ТРЭБА АХОЎВАЦЬ ТУРАЎСКАЕ БАЛОННЕ?

Тураўскае балонне – адно з самых важных у Беларусі месцаў для міграцыйных прыпынкаў і гнездавання многіх відаў водна-балотных птушак. Дзякуючы спецыфічным экалагічным умовам на Тураўскім балонні гняздуецца больш за 50 відаў кулікоў, чаек і іншых птушак, многія з якіх маюць нацыянальны і агульнаеўрапейскі статусы аховы. Падчас міграцый тут адзначаюцца тысячныя чароды, якія складаюцца з некалькіх дзясяткаў відаў вадаплаўных і каляводных птушак. На гэтым поплаве яны кормяцца, адпачываюць і набіраюцца сіл перад далейшым пералётам. Гнездаванне дубальтаў, вялікіх грыцукоў, малых крычак, а таксама прыпынак падчас міграцый вялікай колькасці белалобых гусей, белакрылых рыбачак і баталёнаў далі падставы для надання Тураўскаму балонню статусу Тэрыторыі, важнай для птушак (ТВП) міжнароднага значэння.

Для захавання гэтых відаў на Тураўскім поплаве таксама створаны біялагічны заказнік мясцовага значэння.



Малыя крычкі. Фота М. Сцыборскага



Дубальты. Фота В. Фядосенкі



Чайкі-рыбачкі. Фота С. Зуёнка

# ШТО ПАГРАЖАЕ ТУРАЎСКАМУ БАЛОННЮ?

З усіх беларускіх ТВП Тураўскае балонне – адно з самых праблемных. Па-першае, з-за сваіх сціплых памераў. Унікальныя гнездавыя калоніі кулікоў і чайкавых птушак размешчаны на невялікіх выспах, якія выступаюць з вады па меры сыходу веснавой паводкі. Таму любая надзвычайная падзея, скажам, начны выпас коней у разгар гнездавога сезона, можа ў кароткі тэрмін знішчыць дзясяткі і сотні гнёздаў. Па-другое, з-за блізкасці населенага пункта і, як вынік, празмернай гаспадарчай і рэкрэацыйнай нагрузкі.
Але асноўная сучасная пагроза – гэта зарастанне тэрыторыі хмызнякамі і інвазійным відам ваўчкоў (*Bidens frondosa*), якія трапіў да нас з Паўночнай Амерыкі. З-за спынення традыцыйнага сенакашэння і выпасу менш чым за дзесяць гадоў відавочна зменшылася плошча, прыдатная для гнездавання кулікоў. Па гэтай прычыне ладзіцца штогадовая расчыстка поплава, дзе вітаецца ўдзел захавальнікаў і валанцёраў.



Баталёны. Фота С. Сіроткіна



Кулік-марадунка. Фота В. Фенчука

# СТАНЬЦЕ ЗАХАВАЛЬНІКАМ ТУРАЎСКАГА БАЛОННЯ!



Кнігаўка. Фота Т. Раманавай



Кулікі-случкі. Фота В. Казлоўскага

Калі Вы адчуваеце асабістую адказнасць за **Тураўскае балонне,** наведваеце гэтую тэрыторыю, можаце кантраляваць яе стан і заўважаць пагрозы, жадаеце назіраць за дзікай прыродай, удзельнічаць у адукацыйных і прыродаахоўных мерапрыемствах, то Вы можаце стаць адным з захавальнікаў **ТВП "Тураўскае балонне"** і разам з намі садзейнічаць яго існаванню ў будучыні, незалежна ад Вашага ўзросту, прафесіі і здольнасцей.
Падрабязней: **www.iba.ptushki.org**



Ачыстка поплава ад хмызнякоў. Фота В. Натыканца

